Президента Республики Беларусь / Под редакцией В.Г.Дедкова и Е. А.Касперович. – 2011. – № 6 (90). – 51с.

6. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви [Электронный источник]. – Режим доступа: //www.patriarchia.ru/db/text/141422 (дата обращения: 10.11.2016 г.).

7. Павловская, О.А . Духовно-нравственные аспекты национальной безопасности Беларуси: социально-философский анализ / О. А. Павловская // Идеологические аспекты военной безопасности. Научно-практическое приложение к журналу «Армия» Министерства обороны Республики Беларусь. – 2010. – №1 (10). – С. 3–10.

8. Православная Церковь в Беларуси на рубеже тысячелетий: история и современность. [Электронный источник]. – Режим доступа: //www.zhirovichi-monastery.by/1161 (дата обращения 10.11.2016г.).

9. Самыгин, С. И. Духовная безопасность России как основа российской государственности / С. И. Самыгин, А. В. Верещагина // Гуманитарные, социально-экономические и общественные науки. – 2011. – № 1. – С. 13–16.

10. Шкурова, Е. В. Социальные аспекты функционирования светского государства в Республике Беларусь / Е. В. Шкурова // Философия и социальные науки. – 2007. – № 4. – С. 23–24.

## ФІНАНСАВА-МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ СЕЛЬСКАГА ПРЫХОДСКАГА ПРАВАСЛАЎНАГА ДУХАВЕНСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (40-50-я гг. XIX в.)

*А. У. Ерашэвіч*
*(Мінск, Беларусь)*

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. расійскае самадзяржаўе ўзяло курс на памяншэнне і абмежаванне ўплыву ката-

ліцкай царквы і аднаўленне пануючых пазіцый і ролі праваслаўя ў заходніх губернях Расійскай імперыі. У выніку рэлігійнай канверсіі ўніятаў у 1839–1840 гг. і ліквідацыі Беларускай і Літоўскай уніяцкіх епархій у беларускіх губернях колькасна вырасла колькасць адэптаў праваслаўя. Дамінаванне праваслаўя ў якасці ідэалагічнай апоры расійскага царызму на тэрыторыі Беларусі сярод іншых канфесій забяспечвалася рэалізацыяй шэрагу мерапрыемстваў і захадаў урадавай падтрымкі па паляпшэнні матэрыяльнага становішча і сістэмы грашовага ўтрымання сельскага праваслаўнага прыходскага духавенства, накіраваных на ўмацаванне сацыяльнага прэстыжу, аўтарытэту і ўплыву праваслаўнага кліру не толькі ў буйных губернскіх і ўездных гарадах, але і ў асяроддзі сялянаў у сельскай мясцовасці.

Абмеркаванне пытанняў наконт паляпшэння фінансава-матэрыяльнага забеспячэння ўмоваў жыцця і разнапланавай дзейнасці праваслаўнага духавенства супала з ажыццяўленнем дзяржавай у заходніх губернях секулярызацыі населеных царкоўных і манастырскіх маёнткаў, якая пазбавіла праваслаўную царкву зямельнай уласнасці. У канцы 1841 г. у ведамства Міністэрства дзяржаўных маёмасцей перадаваліся ўсе нерухомыя населеныя маёнткі праваслаўнага і інавернага духавенства заходніх губерняў. У выпадку недахопу даходаў духоўных маёнткаў прадугледжвалася забяспечваць інавернае духавенства за кошт прыбыткаў з канфіскаваных маёнткаў пасля ўплаты даўгоў [16; 17]. 10.05.1843 г. імператар Мікалай I зацвердзіў пераход у кіраванне Міністэрства дзяржаўных маёмасцей нерухомых населеных маёнткаў прыходскіх цэркваў і ў валоданні неправаслаўнага прыходскага духавенства [18; 19]. У сувязі з пераходам па ўказу ад 13.08.1843 г. у казну паддухоўных маёнткаў прычтам з мясцовых казначэйстваў выдаваліся да 1851 г. сумы, роўныя штогадаваму даходу з ранейшых маёнткаў. Але ў 1851 г. у выкананне гэтага ўрадавага распараджэння былі ўнесены карэкцівы. 21.03.1851 г. было атрымана прадпісанне Дэпартамента дзяржаўнага казначэй-

ства Міністэрства фінансаў, згодна якому было загадана выдзяляць прычтам толькі тую частку даходу, які сапраўды паступаў у казну з паддухоўных маёнткаў. Пастаянны ж даход атрымалі толькі тыя прычты, маёнткі якіх пры перадачы ў казну знаходзіліся ў ведамстве арандатараў. Усе астатнія маёнткі ў казённым кіраванні не прыносілі і 1/5 часткі вылічанага з ніх даходу, які да таго ж паступаў ва ўездныя казначэйствы несвоечасова. Толькі пасля прадстаўлення штаб-афіцэра Корпуса жандараў у Мінске А. І. Ламачэўскага гэтая пастанова была скасавана [7, с. 60–61].

Першыя праекты аб паляпшэнні быту прыходскага праваслаўнага духавенства ў сваіх губернях падрыхтавалі падольскі губернатар Р. С. Лашкароў, в. а. віцебскага губернатара П. П. Львоў і кіеўскі ваенны, падольскі і валынскі генерал-губернатар Дз. Г. Бібікаў. Па прапанове міністра дзяржмаёмасцей П. Дз. Кісялёва з студзеня 1841 г. было распрацаванае вопытнае палажэнне аб забеспячэнні 11 сельскіх праваслаўных прыходаў у казённых маёнтках Валынскай і Магілёўскай губерняў. Расходы для ўтрымання праваслаўных прычтаў выдаткоўваліся за кошт даходаў з дзяржаўных маёнткаў. Сялянаў пераводзілі на інвентарнае палажэнне, складзенае на карысць праваслаўнага духавенства. Праваслаўным святарам забаранілі браць плату за выкананне важнейшых царкоўных адправаў і за ажыццяўленне таінстваў [23, с. 179, 180]. Эксперымент па паляпшэнні матэрыяльнага стану прычтаў пры сельскіх праваслаўных цэрквах праводзіўся, але беспаспяхова, у канфіскаваных маёнтках 11 прыходаў Валынскай епархіі і ў прыходзе сяла Мокрае Быхаўскага ўезда Магілёўскай епархіі [25, с. 112–113].

Адпаведна імператарскага ўказа ад 4.04.1842 г. Сіноду з мэтай дзяржаўнай падтрымкі сельскага праваслаўнага прыходскага духавенства ў беларускіх праваслаўных епархіях (Літоўскай, Магілёўскай, Мінскай і Полацкай) для падзеленых на 7 класаў сельскіх царкоўных прычтаў з 1.05.1842 г. прызначаліся пастаянныя аклады жалавання, за

вылікам па 2 кап. з кожнага рубля (2 %), якія залічваліся ў склад асобнага капіталу Св. Сінода для давання аднаразовай дапамогі сельскаму праваслаўнаму духавенству. Дапаможныя грашовыя аклады, выдзеленыя з казны і з капіталаў духоўна-вучэбнага ўпраўлення некаторым праваслаўным прычтам, Сінод размяркоўваў на прычты іншых пазаштатных цэркваў у тых жа епархіях, ці на прычты іншых заходніх епархій. Штогод у Літоўскай, Магілёўскай, Мінскай, Полацкай, 2 уездах Валынскай епархій для ўтрымання праваслаўных прыходскіх святароў, альбо на жалаванне прычтам сельскіх праваслаўных цэркваў выдаткоўвалася 415 тыс. руб. Усе сельскія праваслаўныя прычты, падзеленыя на 7 класаў у залежнасці ад велічыні прыхода і колькасці прыхаджан у іх (ад 100 да 3000 душ вернікаў), за выключэннем безпрыходных цэркваў і прыходаў з колькасцю менш 100 душ, атрымлівалі ад 140 да 576 руб. штатнага жалавання па аднаму з прыходаў 7 разрадаў [11; 4, за 1843 г., с. 48–49; 22]. Уведзеныя пастаянныя штаты павялічылі колькасць праваслаўных сяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў: замест ранейшых святароў і наёмных дзячкоў дадаліся штатныя дыяканы, дзячкі, дзякі, прасфірні. Праваслаўнаму сельскаму прыходу прычту праваслаўнай царквы 1-га класа адпускалася штогод 576 руб., 2-му – 544 руб., 3-му – 324 руб., 4-му – 256 руб., 5-му – 236 руб., 6-му – 160 руб., 7-му – 140 руб. У цэлым, памеры ўсталяванага штогоднага дзяржаўнага жалавання праваслаўнага духавенства абумоўліваліся колькасцю прыхаджанаў, але толькі сяшчэннік у адным з 7 класаў праваслаўных цэркваў атрымліваў неаднолькава ад 100 да 180 руб. (у 1-3 класе – 180 руб., 4 класе – 160 руб., 5-м – 140 руб., 6-м – 120 руб., 7-м – 100 руб.). Астатнім сяшчэнна- і царкоўнаслужыцелям ва ўсіх праваслаўных прыходах плацілі аднолькава: дыякану – 80 руб., дзячку – 40 руб., дзяку – 32 руб., прасфі(о)рне – 24 руб. штогод. Фінансаванне праваслаўных прычтаў магло памяншацца пры наяўнасці ў праваслаўных цэрквах разнастайных мясцовых сродкаў утрымання: ануатаў, працэнтаў з сумаў у

крэдытных установах, зямельных угоддзяў. З 1845 па 1863 гг. рабіліся вылікі з дзяржаўнага жалавання працэнта за казённыя населеныя маёнткі, якія былі пакінуты ў часовым валоданні праваслаўнага духавенства. К 1846 г. толькі ў Літоўскай праваслаўнай епархіі сабралі 25921,93 руб. вылікаў [10, с. 53].

Больш падрабязна парадак забеспячэння сельскага прыходскага праваслаўнага духавенства землямі, дамамі і аднаразовай дапамогай ад прыхаджанаў у губернях Беларусі рэгулявала палажэнне і правілы, вышэйша зацверджаныя 20.07.1842 г. [1; 2; 13]. Згодна правілаў, свяшчэннік ці штатны дыякан, рукапакладзены па сельскаму прыходу альбо пераведзены, павінен быў атрымліваць ад прыхаджанаў з сельскіх запасных магазінаў беззваротна для себе і членаў сваёй сям'і на кожную асобу па 1,5 пуду мукі штомесяц і насенне ў пазыку. Звышштатным свяшчэннікам, дыяканам ці псаломшчыкам вернікі абавязваліся выдаваць па іх прыбыцці па смеце дапамогу хлебам і грашыма: свяшчэнніку 30 руб., дыякану – 20 руб., дзячку – 15 руб. [13, арк. 5 адв.]. Для складання праектаў забеспячэння прычтаў ад прыхаджанаў усім неабходным засноўваліся губернскія камітэты пад кіраўніцтвам губернатара з мясцовага архірэя, губернскага прадвадзіцеля дваранства, кіраўніка губернскай палаты дзяржмаёмасцей. Справаводства ў кожным губернскім камітэце ажыццяўляла асобная часовая канцылярыя, у якую накіроўваліся 2 грамадзянскія чыноўнікі (адзін з губернатарскай канцылярыі, другі – з губернскага праўлення) і 2 прадстаўніка ад духоўнага ведамства. Для набыцця канцылярскіх матэрыялаў дадатковая сума грошай магла паступіць з Міністэрства дзяржмаёмасцей за кошт экстраардынарнай сумы губернскіх палат дзяржмаёмасцей у памеры жалавання чыноўніка губернскага праўлення. Акрамя губернскіх, таксама ствараліся і ўездныя камітэты для забеспячэння прыходскага праваслаўнага духавенства. Абавязак распрацоўкі праектаў утрымання сельскіх праваслаўных прычтаў ускладаўся на губернскія палаты дзяржма-

ёмасцей у казённых і прадвадзіцеляў дваранства ў памешчыцкіх маёнтках. Для абмеру царкоўных земляў уездныя прадвадзіцелі дваранства маглі запрашаць прыватных землямераў па найму з платай ім за кошт сумаў прыватных земскіх павіннасцяў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях не больш 300 руб. Большыя расходы належыла забяспечваць за кошт духоўнага ведамства [2, с. 782, 783]. Для кожнага праваслаўнага прычту ўсталёўвалася норма не менш чым у 33,3 дзесяціны царкоўнай сядзібнай, раллёвай і сенакоснай прыдатнай зямлі, у тым ліку надзел святара – у 10 дзесяцін, хоць некаторыя праваслаўныя цэрквы паводле ранейшых правоў і прывілеяў мелі яе больш.

Такім чынам, палажэнне ад 20.07.1842 г. замацоўвала галоўныя крыніцы ўтрымання і сродкі існавання праваслаўных цэркваў, свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў: казённае жалаванне, даходы з адведзеных зямельных надзелаў, з якіх участак у 10 дзесяцін павінен быў апрацоўвацца самімі прыхаджанамі, якія дастаўлялі святарам ругі, мусілі займацца рамонтам і ацяпленнем прыходскіх памяшканняў, скарбоначныя зборы ад царкоўных службаў (заказных памінальных літургій, паніхід і малебнаў) і даходы з уласнай нерухомай маёмасці.

Аднак працэс складання і разгляду праектаў сельскіх прычтаў пры праваслаўных цэрквах у беларускіх праваслаўных епархіях зацягваўся з-за розных абставінаў. У праваслаўных прыходах казённых маёнткаў адчувалася нескардынаванасць і няўзгодненасць дзеянняў розных уладных структур грамадзянскага і духоўнага ведамстваў. У памешчыцкіх маёнтках маруднасць выпрацоўкі і зацвярджэння праектаў тлумачылася недахопам фінансавых сродкаў для найму прыватных землямераў, неабходных для правільнага і дакладнага вызначэння колькасці, уліку і размеркавання царкоўнай зямлі. Прыватныя ўладальнікі таксама не жадалі, ва ўмовах неўраджаяў і росту дзяржаўнай запазычанасці, браць на сябе непасільны цяжар па выдзяленні зямлі прычтам і выконваць абавязкі па ўтрыманні

праваслаўнага духавенства. Уездныя прадвадзіцелі дваранства, абцяжараныя выкананнем іншых службовых абавязкаў, былі не ў стане хутка скласці праекты і даставіць іх для зацвярджэння ў губернскія камітэты. Да таго ж, праваслаўныя святары часцяком прад'яўлялі завышаныя патрабаванні да прыхаджанаў адносна ўмоваў, парадку і ўзроўню матэрыяльнага забеспячэння. Асабліва гэта назіралася ў былых уніяцкіх прыходах, у якіх апетыты рускіх святароў былы большыя за ранейшых уніяцкіх [9, с. 102]. Да ўзаемных саступак бакі амаль не прыходзілі, а юрыдычная працэдура заключэння дамоваў паміж святарамі і сялянамі спараджала канфлікты паміж імі рознай ступені, формы і працягласці, якія падлягалі няхуткаму вырашэнню. У некаторых прыходах праваслаўныя вернікі абавязваліся выплочваць грошы ўзамен асабістай апрацоўкі памешчыцкай зямлі. Колькасны склад прыходаў мог змяняцца з прычыны пералічэння прыхаджанаў пасля змен розных формаў зямельнай уласнасці, уладальнікаў, пераходаў і г. д. Дадатковыя цяжкасці ўзнікалі ў сувязі з падзеламі паміж членамі прычтаў даходаў з розных угоддзяў фундушавай зямлі. Узнікалі непаразуменні ў прылічэнні да сельскіх прыходаў гарадскіх з прыпісанымі да ніх сельскімі жыхарамі. Калі ў казённую вёску былі разасланыя тыпавые праекты дамоў для праваслаўных святароў, то ў памешчыцкай іх не было, і памяшканні для святароў зноў будаваліся, перабудоўваліся з іншых будынкаў, купляліся і г. д.

Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС 30.12.1846 г. пісаў віцебскаму генерал-губернатару А. М. Галіцыну, што ў падначаленых віленскаму ваеннаму губернатару Ф. Я. Мір кавічу губернях губернскія камітэты па забеспячэнні сельскага праваслаўнага духавенства амаль скончылі свае заняткі па выдзяленні зямлі для праваслаўных цэркваў: ужо былі зацверджаны і выконваліся праекты аб вылучэнні зямлі для 993 праваслаўных цэркваў і заставалася надзяліць зямлёй толькі 29 праваслаўных цэркваў. Віцебскі губернатар рапартаваў 16.12.1847 г. віцебскаму генерал-губернатару,

што ў Віцебскай губерні з 258 праваслаўных прыходаў толькі па 112 (43,4 %) губернскім камітэтам былі складзены і зацверджаны праекты аб забеспячэнні праваслаўнага духавенствамі дамамі, зямлёй і дапамогай, яшчэ разглядаліся 9 праектаў. Віцебскі губернскі камітэт аб забеспячэнні праваслаўнага духавенства паведаміў, што да 26.11.1849 г. былі зацверджаны 137 праектаў, але заставалася надзяліць зямлёй яшчэ 100 праваслаўных прыходаў. Магілёўскі губернатар пісаў 6.02.1847 г. віцебскаму генерал-губернатару, што да гэтага часу ў Магілёўскай губерні з усіх 522 праваслаўных прыходаў былі складзены і зацверджаны губернскім камітэтам праекты аб надзяленні духавенства зямельнымі ўгоддзямі толькі для 209 прыходаў (40 %). Па ўсім амаль сельскім праваслаўным прыходам пры выкананні 10-га артыкула палажэння 20.07.1842 г. узнікалі цяжкасці, звязаныя з паверкай і адводам царкоўных зямель і складанні планаў на яе з прычыны немагчымасці знайсці прыватных землямераў і адсутнасці ў прадвадзіцеляў дваранства сумы на гэты прадмет. 9.11.1848 г. Магілёўскі губернскі камітэт аб забеспячэнні сельскага праваслаўнага духавенства паведаміў віцебскаму генерал-губернатару, што ў Магілёўскай епархіі з усіх 522 праваслаўных цэркваў былі складзены і зацверджаны праекты аб надзяленні зямлёй праваслаўнага духавенства толькі ў 293 цэрквах (56,1 %) па недахопу штатнага землямера. Праз год, 17.11.1849 г. Магілёўскі губернскі камітэт аб забеспячэнні праваслаўнага духавенства зноў пісаў віцебскаму генерал-губернатару, што праекты аб дапамоге былі складзены для 327 праваслаўных цэркваў, неабходна было разгледзіць праекты яшчэ для 195 праваслаўных цэркваў, а ў 35 – распрацаваць дадатковыя да папярэдне складзеных праектаў [14]. К 1852 г. у Літоўскай праваслаўнай епархіі яшчэ заставалася скласці і разгледзіць 115 праектаў прычтаў [4, за 1851 г., с. 42]. Толькі Мінскі губернскі камітэт для забеспячэння праваслаўнага духавенства к 1852 г. завяршыў папярэдні разгляд праектаў па кожнаму сельскаму прыходу ў Мінскай праваслаўнай епархіі.

Ступень забеспячэння праваслаўнага духавенства зямлёй, дамамі, аднаразовай дапамогай заставалася няпоўнай і рознілася ў асобных беларускіх праваслаўных епархіях. Асаблівыя цяжкасці назіраліся ў адносна нядаўна адкрытай Літоўскай праваслаўнай епархіі. К 1861 г. у Магілёўскай праваслаўнай епархіі з 519 прычтаў толькі 78 былі забяспечаны цалкам, 388 – часткова, 16 – не былі зусім, не былі складзены праекты пры 38 праваслаўных цэрквах, а 59 праектаў патрабавалі дапаўненняў [15]. Да 1864 г. у краі надзел у 36 дзесяцін зямлі мелі каля 60 % праваслаўных цэркваў, астатнія – менш, а каля 5 % – былі зусім без зямлі, і прыхаджане забяспечвалі прыходы хлебам і іншымі прадуктамі (руга). Звычайна памешчыкі выдзялялі прыходскаму праваслаўнаму духавенству непрыдатныя для апрацоўкі, аддаленныя ад праваслаўных цэркваў і цераспалосныя ўчасткі зямлі. Праваслаўныя святары жылі ў непрыдатных памяшканнях, яўрэйскіх корчмах і курных сялянскіх хатах. Толькі у 1/3 прыходаў акуратна ажыццяўляўся рамонт і ацяпленне памяшканняў праз іх забеспячэнне палівам [10, с. 53–54].

Паводле палажэння 20.07.1842 г. прыходскае праваслаўнае духавенства спыняла збор даходаў з прыхаджанаў за царкоўныя адправы, якія былі ў некаторых прыходах галоўнай крыніцай утрымання праваслаўных прычтаў. Нягледзячы на тое, што з 1844 г. праваслаўныя святары пазбаўляліся права збору платы за асноўныя царкоўныя адправы (за нараджэнне, хрышчэнне, споведзь, шлюб, ялейасвятленне, пахаванне), у некаторых прыходах і надалей былі зафіксаваныя факты вымаганняў святароў у патрабаванні платы за царкоўныя адправы [12].

З 1845 г. усе 3 ранейшыя сумы, адпускаемыя штогод з дзяржаўнага казначэйства на ўтрыманне праваслаўных цэркваў (прызначаная па штатам ад 26.02.1764 г. і вышэйшым загадам на ўтрыманне розных праваслаўных цэркваў і сабораў, паводле ўказа ад 6.12.1829 г. на дапаможныя аклады прычтам бедных праваслаўных цэркваў, ахвяраваная на ўтрыманне сельскага праваслаўнага духавенства) былі

аб'яднаныя ў адну пад назвай сумы на ўтрыманне гарадскога і сельскага праваслаўнага духавенства з вылікам па 2 % у склад капіталу для дапамогі праваслаўнаму духавенству і рэшткаў ад некамплекту членаў прычту [4, за 1844 г., с. 56; 24, с. 174–175]. Спачатку жалаванне па трэцям года праваслаўным прычтам выдавалі благачынныя, якія часам рабілі з яго свавольныя вылікі на сваю карысць. З 1845 г. у Літоўскай праваслаўнай епархіі быў уведзены парадак атрымання грашовых акладаў з уездных казначэйстваў [3, с. 190, 191]. З 1850 г. належнае ўтрыманне прычтам гарадскіх і сельскіх праваслаўных цэркваў выдавалася з уездных казначэйстваў за кожнае мінулае паўгоддзе ў пачатку наступнага [20].

Штатнае жалаванне членам праваслаўных прычтаў пастурала з дзяржаўнага казначэйства, а дапаможныя аклады – з дзяржаўнага казначэйства і духоўна-вучэбных капіталаў Сінода. У выніку ўрадавай рэгламентацыі з 1844 г. у беларускіх праваслаўных епархіях выдаваліся пастаянныя сумы (ад 431 да 436 тыс. руб. штогод) для ўтрымання ад 1851 да 1899 прычтаў (гл. табл. 1).

Табл. 1 – Утрыманне прычтаў у беларускіх праваслаўных епархіях (1842–1860 гг.) [Падлічана па: 4, вед. № 16; 5, за 1854–1857 гг., вед. № 16, за 1858 г., вед. № 26; за 1859 г., вед. № 25; 6, вед. № 26]

| | Полацкая | | Магілёўская | | Мінская | | Літоўская | | Разам | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Прычтаў | Сума, руб. | Прычтаў | Сума, руб. | Прычтаў | Сума, руб. | Прычтаў | Сума, руб. | Прычтаў | Сума, руб. |
| 1842 | 30 | 8918,59 | 27 | 3570,36 | 23 | 2713,43 | 12 | 6007,65 | 92 | 21210,03 і 112 асігнацыямі |
| 1843 | 68 | 5577,19 | 12 | 1714,08 | 69 | 9639,93 | 24 | 7432,65 | 173 | 24363,85 |
| 1844 | 358 | 80314,77 | 528 | 119777,37 | 550 | 121813,93 | 463 | 111765,1 | 1899 | 433671,17 |
| 1845 | 351 | 80263,11 | 526 | 119379,37 | 545 | 121093,93 | 463 | 112774 | 1885 | 433510,41 |
| 1846 | 344 | 79966,31 | 524 | 119150,83 | 545 | 120997,93 | 465 | 113047,1 | 1878 | 433162,17 |
| 1847 | 341 | 79579,21 | 524 | 119150,83 | 545 | 121087,93 | 464 | 112717,1 | 1874 | 432535,07 |
| 1848 | 339 | 79292,21 | 524 | 119150,83 | 545 | 121087,93 | 464 | 112717,1 | 1872 | 432248,07 |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1849 | 332 | 78479,82 | 524 | 119150,83 | 544 | 120927,93 | 462 | 112540 | 1862 | 431098,58 |
| 1850 | 329 | 78615,37 | 523 | 119010,83 | 543 | 121161,1 | 462 | 112540 | 1857 | 431327,3 |
| 1851 | 331 | 79134,47 | 523 | 118755,83 | 542 | 121021,1 | 462 | 112540 | 1858 | 431451,4 |
| 1852 | 334 | 80432,37 | 523 | 118755,83 | 542 | 120977,1 | 462 | 112540 | 1861 | 432705,3 |
| 1853 | 334 | 80948,27 | 523 | 118965,83 | 541 | 120953,1 | 462 | 112540 | 1860 | 433407,2 |
| 1854 | 334 | 81493,27 | 523 | 118965,83 | 541 | 121046,27 | 462 | 112965 | 1860 | 434470,37 |
| 1855 | 334 | 81518,27 | 523 | 119016,83 | 540 | 120982,27 | 462 | 112965 | 1859 | 434482,37 |
| 1856 | 334 | 81614,87 | 523 | 119101,83 | 539 | 121953,27 | 462 | 112965 | 1858 | 435634,97 |
| 1857 | 334 | 81448,67 | 522 | 118985,63 | 537 | 121909,27 | 462 | 112965 | 1855 | 435308,57 |
| 1858 | 334 | 81283,17 | 522 | 119215,63 | 537 | 121909,27 | 462 | 112965 | 1855 | 435373,07 |
| 1859 | 331 | 81024,87 | 522 | 119289 | 536 | 121903,57 | 462 | 112965 | 1851 | 435182,44 |
| 1860 | 332 | 80574,37 | 522 | 119863,13 | 536 | 122588,39 | 462 | 112965 | 1852 | 435990,89 |

У рамках дапамогі галадаючым пасля неўраджаяў з прычыны дарагоўлі ў 1845 г. на карысць паўніяцкага духавенства Сенненскага ўезда было накіравана 2000 руб. з агульных капіталаў духавенства. У 1846 г. беззваротна з друкарскага капіталу Сінода свяшчэннаі царкоўнаслужыцелям у Магілёўскай і Полацкай епархіях паступіла па 1500 руб. [4, за 1845 г., с. 91, за 1846 г., с. 89]. Віцебскі губернскі прадвадзіцель дваранства дакладваў 28.02.1845 г. віцебскаму генерал-губернатару, што ў мінулых двух гадах дваранства Віцебскай губерні «по воле правительства и христианскому долгу» выдаткавала на будаўніцтва і рамонт праваслаўных цэркваў больш чым па 2 руб. з кожнай рэвізскай душы мужчынскага полу, ці да 500 тыс. руб. у Віцебскай губерні. З-за неўраджаю і беднага стану памешчыцкіх маёнткаў узніклі цяжкасці з пабудовай для святароў і прычтаў новых дамоў са службамі. Таму ён прасіў адтэрмінаваць уладкаванне дамоў са службамі для святароў і прычтаў сельскага духавенства ў Віцебскай губерні на 2 гады. Аднак Дэпартамент агульных спраў МУС адхіліў гэтую просьбу. Па меркаванні віцебскага генерал-губернатара, крайнія цяжкасці ў размяшчэнні праваслаўнага духавенства не прыводзілі да асаблівых выдаткаў землеўласнікаў, якія мелі ўладальніцкі лес і прыгонных сялянаў. Міністэрства ўнутраных спраў для пабудовы дамоў для праваслаўных святароў раіла аказаць некато-

рую дапамогу толькі тым памешчыкам, якія найбольш пацярпелі ад мінулых неўраджаяў [14, арк. 90, 90 адв., 101–101 адв., 109].

Пазбаўленыя даходаў ад царкоўных таемстваў, праваслаўныя святары не атрымоўвалі і належнай платы за апрацоўку царкоўнай зямлі. У запіске обер-пракурору Сінода ад 11.03.1855 г. архіепіскап полацкі Васіль Лужынскі падкрэсліў, што дзяржаўныя аклады прычтам складалі «адзіны сродак існавання для большай часткі духоўных сем’яў». Іншыя крыніцы забеспячэння (пабудова дамоў, апрацоўка сялянамі фундушавай зямлі ці даванне замест яе ўмоўнай платы) «едва в последние 2 года по значительной части приходов приведены в действо». Апрацоўка ўчасткаў святарскай зямлі вялася несвоечасова, неахайна, выклікала незадавальненне сялянаў. Замест натуральных павіннасцей добраахвотна дамоўленыя сумы грашовай уплаты паступалі несвоечасова, у няпоўным памеры ці не плаціліся зусім. На памешчыках за некалькі гадоў накапіліся значныя даўгі на карысць святароў у памеры да 400 руб. сер. і нават больш [8, с. 244, 246]. Некаторыя каталіцкія памешчыкі выкарысталі ўскладзены на іх абавязак па забеспячэнні праваслаўных прычтаў як магчымасць да накладання на прыгонных сялянаў дадатковых грашовых збораў. У прыватнасці, у Валожыне з праваслаўных вернікаў без розніцы полу і ўзросту з душы спаганялі па 7,5 кап. (з 4727 душ абодвух палоў – 354,32 руб.), з якіх святару давалі толькі 128,5 руб., а ў Бакштах з акладной душы – па 4,5 кап. (з 2890 душ – 130 руб.), з якіх святар атрымліваў толькі 64,25 руб. Некаторыя памешчыкі Дзісенскага ўезда спаганялі апрацовачныя грошы [3, с. 185, 186].

Ва ўсялякім разе, выдзеленых урадам свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелям праваслаўных цэркваў сельскіх прычтаў беларускіх праваслаўных епархій сумаў было відавочна недастаткова, па ўзроўні з прадстаўнікамі іншых хрысціянскіх веравызнанняў. Так, у малалікіх прыходах Полацкай праваслаўнай епархіі сярэдні гадавы прыбытак святара дасягаў 270 руб., у той час як лютэранскага пастара – каля

775 руб. [25, с. 165]. У 1859 г. Камітэт пры Сінодзе пачаў перагляд палажэння аб забеспячэнні сельскіх праваслаўных прычтаў у заходніх губернях.

Такім чынам, павелічэнне ў беларускіх губернях праваслаўнай паствы за кошт далучэння ўніятаў паставіла перад расійскім урадам пытанне аб колькасным прырашчэнні культавых будынкаў і праваслаўных свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў у сельскіх прыходах. Змены прынцыпаў матэрыяльна-фінансавага ўтрымання (секулярызацыя царкоўнай зямельнай уласнасці і замена ранейшых нетрывалых зямельных даходаў і адвольных грашовых пераважна пастаяннымі грашовымі) і перагляд ранейшых крыніцаў даходаў праваслаўнага святарства (ад сваіх прыходаў, з нерухомай маёмасці і капіталаў, з царкоўнай дзесяціны, ануаты, зямельных угоддзяў, якія апрацоўвалі і фундушавыя сяляне) мелі мэтай ўзвысіць у краі аўтарытэт, прэстыж і ступень уплыву на вернікаў праваслаўнага духавенства, з’яўляліся сродкам распаўсюджвання і ўмацавання пануючага у Расійскай імперыі праваслаўя. Стварэнне трывалай дзяржаўнай фінансава-матэрыяльнай базы для дзейнасці праваслаўнай царквы ў заходніх губернях меркавалася як спосаб пераадолення беднасці праваслаўных святароў з мэтай змяншэння матэрыяльнай залежнасці сельскага праваслаўнага духавенства ад каталіцкіх памешчыкаў. Гэтыя ідэі праводзіліся ў жыццё у мэтах прадухілення сепаратысцкіх польскіх памкненняў для захавання тэрытарыяльнасй цэласнасці Расійскай імперыі, дзеля падтрымкі сацыяльнай стабільнасці ў пагранічных губернях, у рамках канструявання афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі, калі выпрацоўваліся і рэалізоўваліся захады ўрада па дэпаланізацыі грамадства краю пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг., распальваліся супярэчнасці паміж праваслаўнымі сялянамі і іх адвечнымі прыгнятальнікамі памешчыкамі-каталікамі для фарміравання сярод дзяржаўных і асабліва прыгонных сялянаў этацысцка-патэрналісцкіх настрояў

і веры ў добрага і справядлівага праваслаўнага цара, які абараняў інтарэсы сялянаў і змагаўся з іншавернымі панамі-эксплуататарамі.

Аднак запланаваныя царскімі ўладамі меры ў беларускіх праваслаўных епархіях па паляпшэнні матэрыяльнага стану праваслаўных цэркваў і расселенага на вялікай прасторы ў малалікіх прыходах пераважна малаадукаванага праваслаўнага духавенства, якое было абцяжаранае неабходнасцю ўтрымання сваіх вялікіх сем’яў, выконваліся несвоечасова, у няпоўным аб’ёме, а мяркуемыя чаканні не супадалі з рэчаіснасцю. Ранейшыя добраахвотныя адносіны паміж праваслаўнымі святарамі і вернікамі былі замененыя абавязковымі павіннасцямі праваслаўных прыхаджанаў (каталіцкія былі ад ніх вызвалены). З аднаго боку, прызначаныя ўрадам пастаянныя сумы штатнага штогоднага жалавання ў якасці мяркуемай галоўнай крыніцы ўтрымання праваслаўнага сельскага прыходскага духавенства збаўлялі апошняе ад шчыльнай залежнасці адносна даходаў бедных сялянскіх праваслаўных прыхаджанаў. Уведзеныя дзяржаўныя штатныя штогодныя грашовыя аклады жалавання нівеліравалі розніцу ў ступені прыбытковасці асобных праваслаўных прыходаў і розніцу ў неаднастайных крыніцах іх фінансавага ўтрымання. У той жа час праваслаўным свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелям відавочна не хапала сумаў штатных акладаў жалавання, недахоп якога яны часткова пакрывалі за кошт ранейшых платаў за царкоўныя адправы, з дзесяціны і іншых крыніцаў. Іншай роўнай з грашовым утрыманнем ці большай крыніцай матэрыяльнага дабрабыту праваслаўных чыноў заставалася земляробства. Аднак памешчыкі-каталікі перашкаджалі надзяленню праваслаўных цэркваў уласнай зямлёй, і аддавалі маладаходныя цераспалосныя ўгоддзі, часам участкі ўдалечыні ад праваслаўных храмаў. Зразумела, што сельскія праваслаўныя прыхаджане, альбо пазбаўленыя грамадзянскіх правоў прыгонныя сяляне, якія знаходзіліся ў асабістай і пазямельнай залежнасці ад пераважна каталіцкіх памешчыкаў, павінны былі забяспечваць

праваслаўных свяшчэннікаў прадуктамі, апрацоўваць іх царкоўныя землі натурай ці ўносіць грашовую кампенсацыю, займацца пабудовай, рамонтам і ацяпленнем дамоў прычтаў, таксама не былі задаволеныя накладзенымі на ніх дадатковымі павіннасцямі ў дадатак да паншчыны і іншых збораў. Каталіцкія землеўласнікі і прадстаўлены імі мясцовы адміністрацыйны апарат свядома альбо пад уплывам аб'ектыўных і суб'ектыўных абставінаў бяздзейнічалі, сабаціравалі ці зацягвалі працу па надзяленні ўсім неабходным сельскіх праваслаўных прычтаў пры праваслаўных цэрквах.

У цэлым, першапачатковыя задумы расійскіх уладаў па змяншэнні ўплыву каталіцкага кліра і павелічэнні ролі праваслаўнай царквы ў грамадскім жыцці краю да паўстання 1863–1864 гг. не былі рэалізаваныя цалкам, а ўрадавыя дзеянні нават мелі адваротны вынік, паколькі не толькі не палепшылі ўзаемныя стасункі, не пагасілі двухбаковы недавер, але і садзейнічалі росту ўзаемнага незадавальнення паміж праваслаўнымі святарамі і вернікамі, схілялі апошніх у бок каталіцтва.

Уніфікацыя сістэмы фінансава-матэрыяльнага ўтрымання прычтаў пры сельскіх парафіяльных праваслаўных цэрквах у беларускіх праваслаўных епархіях у 40-50-я гг. XIX ст. праз увядзенне аднастайных акладаў для кожнага класнага праваслаўнага прыхода азначала амаль поўнае фінансавае падпарадкаванне праваслаўнай царквы і адміністрацыйны кантроль за ёй з боку манархічнай дзяржавы.

## Літаратура и крыніцы

1. Высочайше утвержденное 20.07.1842 г. положение об обеспечении православного сельского духовенства землями, домами и единовременными пособиями в губерниях Витебской, Могилёвской, Минской, Виленской, Гродненской, в Ковельском и Овручском уездах Волынской и в Белостокской области // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2-е (далей – ПСЗ-2). – Т. 17-1. – № 15872. – С. 771–780.

2. Высочайше утвержденные 20.07.1842 г. правила для приведение в действо положения о обеспечении православного сельского духовенства землями, домами и единовременными пособиями в западных губерниях // ПСЗ-2. – Т. 17-1. – № 15873. – С. 780–783.

3. Извеков, Н. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г. / Н. Д. Извеков. – М. : печ. А. И. Снегирёвой, 1899. – 522 с.

4. Извлечение из отчета обер-прокурора Святейшего Синода за 1842–1853 гг. – СПб. : Синодальная тип., 1843–1854.

5. Извлечение из отчета по Ведомству духовных дел православного исповедания за 1854–1859 гг. – СПБ. : Синодальная тип., 1855–1861.

6. Извлечение из отчета по Ведомству православного исповедания за 1860 г. – СПБ. : Синодальная тип., 1862.

7. Ломачевский, А. И. Из воспоминаний жандарма 30 и 40 годов : в 2 ч. / А. И. Ломачевский. – СПб. : Тип. В. Грацианского, 1880. – Ч. 2 : Голубой мундир. – 227 с.

8. Лужинский, Василий. Записки Василия Лужинского, архиепископа полоцкого и витебского, члена святейшего Правительствующего Всероссийского Синода о начале и ходе окончательно совершившегося дела воссоединения греко-униатской церкви в Белоруссии и Волыни с православною российскою церковью, написанные в конце 1866 г. / Василий Лужинский. – Казань : изд. Казан. дух. акад., типография Императорского университета, 1885. – 312 с.

9. Маркс, М. Записки старика (Витебск с 1821 по 1840 г.) / М. Маркс // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2. – С. 87–102.

10. Миловидов, А. Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае / А. Миловидов. – Харьков : Тип. Губернского правления, 1900. – 92 с.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19248. Арк. 2.

12. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19970. Арк. 77 адв., 93–94 адв., 106.

13. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 294. Арк. 2–5 адв.

14. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 13431. Арк. 182–182 адв., 184 адв. –185, 186 адв. –187, 188, 188 адв., 196–196 адв., 229–229 адв., 229 адв. –230, 250, 251 адв., 254, 255.

15. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 746. Арк. 2.

16. О передаче в ведение и управление Министерства государственных имуществ всех недвижимых населенных имений православного духовенства западных губерний: именной указ 25.12.1841 г., данный Синоду, распубликованный 30.12.1841 г. // ПСЗ-2. – Т. 16-2. – № 15152. – С. 138–139.

17. О передаче в ведение и управление Министерства государственных имуществ всех недвижимых населенных имений иноверного духовенства западных губерний: именной указ 25.12.1841 г., данный Сенату, распубликованный 30.12.1841 г. // ПСЗ-2. – Т. 16-2. – № 15153. – С. 139–140.

18. О передаче в ведение Министерства государственных имуществ недвижимых населенных имений приходских церквей: именной указ 10.05.1843 г., данный Святейшему Синоду // ПСЗ-2. – Т. 18-1. – № 16828. – С. 304–305.

19. О передаче в управление Министерства государственных имуществ недвижимых населенных имений, состоящих во владении иноверного приходского духовенства: именной указ 10.05.1843 г., данный Сенату // ПСЗ-2. – Т. 18-1. – № 16829. – С. 305.

20. О порядке производства содержания городскому и сельскому духовенству: именной указ 11.02.1850 г., объявленный Сенату Святейшим Синодом // ПСЗ-2. – Т. 25-1. – № 23915. – С. 113; Правила о порядке производства содержания городскому и сельскому духовенству // Там жа. – Т. 25-2. – С. 34.

21. О порядке производства содержания городскому и сельскому духовенству: именной указ 11.02.1850 г., объявленный Сенату Святейшим Синодом // ПСЗ-2. Т. 25-1. № 23915. С. 113; Правила о поряд-

ке производства содержания городскому и сельскому духовенству // Там жа. – Т. 25-2. – С. 34.

22. О штатах для причтов сельских церквей в епархиях Литовской, Могилёвской, Минской и Полоцкой и в двух уездах Волынской: именной указ 4.04.1842 г., данный Синоду // ПСЗ-2. – Т. 17-1. – № 15470. – С. 264.

23. Римский, С. В. Российская церковь в эпоху великих реформ (церковные реформы в России 1860–1870-х гг.) / С. В. Римский. – М. : Крутицкое патриаршее подворье, 1999. – 568 с.

24. Руководственные для православного духовенства Указы Святейшего Правительствующего Синода 1721–1878 гг. – М. : Тип. М. Н. Лаврова и К, 1879. – [III], 504 с.

25. Шевкун, П. В. Империя и церковь: российская политика в отношении православия на территории Беларуси (1796–1855 гг.) : монография / П. В. Шевкун. – Витебск : ВГМУ, 2015. – 202 с.

## УКЛАД ПРАВАСЛАЎНЫХ СВЯТАРОЎ У АРХЕАЛАГІЧНУЮ НАВУКУ БЕЛАРУСІ (XIX – ПАЧАТАК XX СТСТ.)

*Л. У. Дучыц, В. У. Мядзведзева*
*(Мінск, Беларусь)*

Многія святары хрысціянскіх канфесій, асабліва праваслаўныя, у XIX – пачатку XX ст. актыўна цікавіліся старажытнасцямі на тэрыторыі Беларусі, збіралі фальклор, запісвалі легенды і паданні пра гарадзішчы і курганы, а некаторыя атрымлівалі «Дазвол» ад Імператарскай Археалагічнай камісіі і самі праводзілі раскопкі. Шмат імёнаў святароў сярод аўтараў археалагічных, гістарычных, этнаграфічных і краязнаўчых артыкулаў не толькі ў правінцыйных выданнях, але і ў цэнтральных навуковых часопісах і зборніках. У працы ўсіх 15-ці Імператарскіх Археалагічных з'ездаў Расійскай імперыі